ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама

А.Л. Вярсоцкі
2018 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ
## аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб'яднанняў “Свет захапленняў”

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб'яднанняў “Свет захапленняў” (далей – Агляд-конкурс).

2. Мэтамі і задачамі Агляду-конкурсу з’яўляюцца: выяўленне новых сучасных форм работы, вызначэнне шляхоў развіцця аматарскага руху, далучэнне насельніцтва да каштоўнасцей беларускай культуры, прыцягненне да культурна-масавых мерапрыемстваў розных узроставых катэгорый насельніцтва; садзейнічанне стварэнню новых аб'яднанняў, далучэнню насельніцтва да розных форм дасугавай дзейнасці; абагульненню існуючага вопыту, яго прапагандзе і ўкараненню ў практыку клубнай работы.

3. Арганізатарамі Агляду-конкурсу з’яўляюцца: галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама, ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”.

4. Агляд-конкурс праводзіцца 1 раз у 2 гады адпаведна графіку.

5. Агляд-конкурс праводзіцца ў 2 этапы: 1 этап – раённыя адборачныя агляды, 2 этап – абласны адборачны агляд і ўзнагароджванне ўдзельнікаў.

6. У рамках 1 этапа кожны раён павінен правесці адборачныя агляды аматарскіх аб’яднанняў з мэтай вылучэння лепшых для ўдзелу ў 2 этапе.

7. 2 этап – абласны тур, у якім аддзелы ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі гаррайвыканкамаў прадстаўляюць 4-5 лепшых аматарскіх аб’яднанняў – пераможцаў раённых і гарадскіх тураў.

8. Да ўдзелу ў Аглядзе-конкурсе аматарскім аб’яднанням неабходна падрыхтаваць: статут аб’яднання, сцэнарыі, відэафільмы, фотаматэрыялы пасяджэнняў, копіі водгукаў сродкаў масавай інфармацыі аб творчай дзейнасці калектыву, пасяджэнне (па магчымасці - адкрытае), якое найбольш яскрава адлюстроўвае накірунак яго дзейнасці.

9. Журы Агляду-конкурсу ўзнагароджвае дыпломамі лаўрэата (I, II, III ступені) і прызамі: пераможцаў у дзвюх узроставых катэгорыях (дзіцячая, дарослая) па наступных намінацыях:

1) грамадска-культурны клуб (інтэлектуальныя, клубы воінаў-інтэрнацыяналістаў, ветэранаў, клубы дзяцей і падлеткаў, моладзі, жанчын і інш.);

2) гісторыка-краязнаўчы клуб (клубы аматараў гісторыі, вывучэння гісторыі роднага краю і інш.);

3) клуб традыцыйнай народнай культуры (клуб аматараў фальклору, майстроў дэкаратыўна-прыкладной творчасці);

4) клуб творчых асоб (паэтаў і кампазітараў, бардаў, аматараў музыкі, песні, тэатра, кіно, літаратуры, творчай інтэлігенцыі);

5) клуб аматараў выяўленчага мастацтва (мастакоў, фотамастакоў, аматараў ікебаны, фларыстыкі і інш.);

6) прыродазнаўчы клуб (экалагічны, клуб садаводаў, агароднікаў, кветкаводаў, птушкаводаў, аматараў жывёл, акварыумістаў і інш.);

7) спартыўны і фізкультурна-аздараўленчы клуб (клуб загартоўвання, аматараў народнай медыцыны, бегу, аэробікі, вандраванняў і турызму, гісторыі алімпійскага руху і спорту, клуб балельшчыкаў і інш.);

8) навукова-тэхнічны клуб (клуб тэхнічнай творчасці, вынаходнікаў і рацыяналізатараў, аматараў мадэліравання, камп'ютарнай і іншай тэхнікі);

9) калекцыйна-збіральніцкі клуб (калекцыянераў, філатэлістаў, аматараў антыкварыяту, нумізматаў і інш.);

10) сямейна-бытавы клуб (клуб аматараў кулінарыі, беларускай кухні, шыцця, вязання і іншых відаў рукадзелля; клубы маладой сям'і, шматдзетных маці, паляўнічых, рыбаловаў, мота-, вела-, аўтааматараў і інш.).

10. Спецыяльнымі дыпломамі і прызамі ўзнагароджваюцца ўстановы клубнага тыпу ў наступных намінацыях: “За лепшую арганізацыю работы з моладдзю”, “За лепшую арганізацыю работы з людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі”.

11. Спецыяльнымі дыпломамі і прызамі ўзнагароджваюцца пераможцы сярод раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці, аддзелаў метадычнай работы раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці “За лепшую арганізацыю работы па падрыхтоўцы да абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб'яднанняў “Свет захапленняў”.

12. Журы мае права аб'ядноўваць, падзяляць лаўрэацкія месцы, вызначаць дадатковыя намінацыі, а таксама ўзнагароджваць канкурсантаў

дадатковымі дыпломамі і прызамі (у рамках выдзеленага прызавога фонду).

13. Пры падвядзенні вынікаў Агляду-конкурсу і заахвочванні пераможцаў журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі: сучаснасць формы работы, актуальнасць тэмы, мастацкі ўзровень і артыстызм вядзення пасяджэння, мастацкі ўзровень сцэнарнага матэрыялу, рэжысёрскае рашэнне.

14. Рашэнне журы з’яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

15. Фінансаванне Агляду-конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”.

16. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: прызы, дыпломы.

17. Для фінансавання Агляду-конкурсу на ўсіх этапах могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

18. Арганізатары Агляду-конкурсу захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў аматарскіх аб'яднанняў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб'яднанняў "Свет захапленняў"

# ГРАФІК

***правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб'яднанняў "Свет захапленняў"***

***<u>Студзень</u>***

1. Воранаўскі раён.
2. Іўеўскі раён.
3. Ашмянскі раён.
4. Смаргонскі раён.
5. Астравецкі раён.

***<u>Люты</u>***

6. Слонімскі раён.
7. Зэльвенскі раён.
8. Ваўкавыскі раён.
9. Свіслацкі раён.
10. Бераставіцкі раён.
11. Мастоўскі раён.

***<u>Сакавік</u>***

12. Карэліцкі раён.
13. Навагрудскі раён.
14. Дзятлаўскі раён.
15. Лідскі раён.
16. Шчучынскі раён.
17. Гродзенскі раён.
18. г. Гродна.